# Мысьліцель, ідэоляг, арганізатар

*...ідэя наша — несьмяротная,*
як несьмяротны і народ беларускі![1]

Пытаньне аб выданьні спадчыны Антона Луцкевіча (29.01.1884—23.03.1942) стаіць даўно. Аднак ні на Бацькаўшчыне, ні ў дыяспары асяродкі, якія займаюцца вывучэньнем беларускае гісторыі і гісторыі беларускае культуры, за 60 год пасьля сьмерці Луцкевіча так і ня выдалі ніводнае ягонае кнігі. І толькі ў 2003 годзе ў „Беларускім кнігазборы“ сьвет убачыў зборнік выбраных твораў Луцкевіча „Да гісторыі беларускага руху“ (далей — *ДГБР*). Цяпер увазе чытачоў прапануецца яго чарговая кніга, якую можна разглядаць і як працяг, і як разьвіцьцё папярэдняе з пэўнымі агаворкамі. Па–першае, у новую кнігу ня ўключаны ніводзін твор са зьмешчаных у *ДГБР*. Па–другое, літаратурна–мастацкая крытыка і працы Луцкевіча з гісторыі культуры склалі адмысловы зборнік „Выбраныя творы: Праблемы культуры, літаратуры і мастацтва“ (далей — *ПКЛіМ*), які ўбачыў сьвет у 2006 годзе.

Робячы так, каб адзін зборнік не дубляваў другі, я жадаю як мага шырэй данесьці чытачу творчую спадчыну Луцкевіча. І ўсё ж мае магчымасьці абмежаваныя. У гэтай кнізе, напрыклад, няма ніводнае мовазнаўчае працы Луцкевіча, бо я ня маю дастатковых ведаў у галіне лінгвістыкі. Акрамя таго, па–за кнігай засталіся артыкулы Луцкевіча габрэйскае тэматыкі[2], а таксама ягоныя пераклады: кніг Новага Запавету або „Кнігі джунгляў“ Рэдзьярда Кіплінга.

Агулам кажучы, творы знакавых палітычных дзеячоў (а да іх адносіцца і Луцкевіч) трэба друкаваць у храналягічнай пасьлядоўнасьці. Тады відаць разьвіцьцё дзеяча, лепш прасочваецца ягоны жыцьцёвы і творчы шлях. Таму ў гэтай кнізе няма жанравых разьдзелаў. У першым разьдзеле зьмешчаны беларускамоўныя тэксты, аўтарам або суаўтарам якіх быў Луцкевіч, у другім — пераклады яго польскамоўных тэкстаў, акрамя артыкулу „Аграрная праграма“, у трэцім — дзёньнік. Маецца таксама разьдзел „Дадатак“.

## I

Фармаваньне нацыі немагчымае бяз слова — вуснага і пісьмовага. Калі гаворка ідзе пра Луцкевіча, дык у яго асобе мы маем аднаго з заснавальнікаў беларускае пэрыёдыкі, самага найстарэйшага і найвыдатнейшага публіцыста[3]. Мне цяжка назваць каго яшчэ зь беларускіх журналістаў, які б працаваў у друку бесьперапынна 33 гады і зь іх недзе 25 гадоў — аўтарам перадавых артыкулаў. У Луцкевічавай публіцыстыцы адлюстраваная гісторыя беларускага руху. Мала таго, у ягонай публіцыстыцы фармуляваліся далёка– і кароткасяжныя задачы гэтага руху, распрацоўвалася тэорыя дзяржаўнага будаўніцтва і партыйная праграматыка. Луцкевіч, бадай, як ніхто з беларускіх палітыкаў умеў не толькі камэнтаваць, але і прагназаваць падзеі, пра што асабліва сьведчыць ягоная праца „Усходняе пытаньне і Бе-

[1] [Луцкевіч А.] Ідэя і кулак // Народная Справа. 1926. 19 кастр.

[2] Тым, хто цікавіцца публікацыямі на гэтую тэму, назаву некаторыя: Б. Аб жыдох // Наша Ніва. 1907. 4 (17) тр.; Б. Агранічэньні ў законах для жыдоў // Наша Ніва. 1907. 21 сьнеж.; Г. Б. Справа Бэйліса // Наша Ніва. 1913. 17 кастр.; Г. Б. Канец справы Бэйліса // Наша Ніва. 1913. 31 кастр.; Н. В. Палякі і жыды // Homan. 1918. 20 жн.; Беларусы і жыды // Сын Беларуса. 1924. 10 жн.; Жыды і зямля // Сын Беларуса. 1924. 24 жн.; І. Мялешка. Хатнія справы // Беларуская Ніва. 1925. 2 сьнеж.

[3] Гл.: Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Менск, 1992. С. 372.

ларусь“. Нельга не адзначыць і тое, што Луцкевіч быў палемістам. За свой працяглы век у журналістыцы ён палемізаваў і з расейскімі чарнасоценцамі, і з польскімі шавіністамі, і з правымі дзеячамі ў беларускім руху. Застаючыся да канца жыцьця артадаксальным марксістам, ён быў крытыкам і сацыял–здрадніцтва, і сталінізму, і польскага камунізму.

Эўрапеец паводле адукацыі, выхаваньня, вызнаваных ім каштоўнасьцяў і арыентацыі, Луцкевіч пісаў ня толькі па–беларуску. Публікуючы ў гэтай кнізе побач з арыгінальнымі творамі пераклады ягоных публікацыяў у тыднёвіку „Przegląd Wileński“, вымушаны прызнацца, што, на жаль, мне не ўдалося пазнаёміцца з усімі яго матэрыяламі ў гэтым выданьні, а за тыя артыкулы і эсэ, што друкуюцца тут, я павінен падзякаваць Алесю Бяляцкаму. Працы з „Przeglądu Wileńskiego“ адрозьніваюцца ад твораў у беларускім друку: у беларускіх газэтах Луцкевіч — аўтар пераважна надзённых артыкулаў, палеміст, трыбун, прапагандыст; у польскіх тэкстах ён больш папулярызатар і асьветнік, больш эсэіст, чым публіцыст.

Сталася так, што пэўны час мне былі недаступныя віленскія сховішчы. Таму ў гэтай кнізе маецца пераклад толькі аднаго тэксту Луцкевіча, апублікаванага ў „Gazecie Wileńskiej“ Міхала Ромэра, і зусім няма перакладаў з газэты „Kurjer Krajowy“, выданьне якой інсьпіравала БСГ. З тае ж прычыны тут няма ніводнага артыкулу Луцкевіча зь віленскай „Вечерней газеты“, якую ён „вёў“ у 1912—1914 гг. Па–руску Луцкевіч друкаваўся таксама ў „Московском еженедельнике“, у часопісах „Запросы жизни“ і „Области и народы“, аднак і гэтыя выданьні пакуль што недаступныя мне. Не абсьледавана нямецкая ды француская пэрыёдыка 1919 г., у якой, паводле ягонага прызнаньня[1], Луцкевіч зьмяшчаў свае матэрыялы, а таксама чэскі часопіс „Slovansky Přehled“, дзе ён друкаваўся ці ня з 1909 г.

Іншы раз Луцкевіч даваў інтэрвію. Дзякуючы Віталю Скалабану, які прапанаваў мне копію гутаркі Луцкевіча з карэспандэнтам газэты „Белорусское Эхо“ (Кіеў) і пераклад гэтае гутаркі ў „Дзяньніцы“, высьвятляецца, як гэты тэкст зьявіўся на старонках петраградзкага часопісу „Чырвоны Шлях“. А менавіта часопісная публікацыя і ўспаміны Вацлава Іваноўскага, запісаныя Н. Недасекам (Антонам Адамовічам), давалі некаторым гісторыкам, у тым ліку акадэміку Іларыёну Ігнаценку, падставу снаваць думку пра тое, што Луцкевіч у 1918 г. езьдзіў у Маскву і сустракаўся там з Уладзімерам Леніным[2]. Дзякуючы Алесю Пашкевічу ўдалося вэрыфікаваць і тэкст гутаркі Луцкевіча з карэспандэнтам газэты „Kurjer Polski“. Таму ў дадзенай кнізе друкуецца трохі іншы, чым у газэце „Беларусь“, пераклад гэтага інтэрвію.

І асобна трэба сказаць, што ў БДАМЛМ (ф. 3, воп. 1, адз. зах. 206, арк. 37) захоўваецца тэкст гутаркі Луцкевіча з карэспандэнтам газэты „Унзэр Тог“, але я не настолькі ведаю ідыш, каб перакладаць зь яго. Дарэчы, у кастрычніку 1921 г. Луцкевіч напісаў вялікі артыкул па–расейску для нейкага габрэйскага выданьня, які тэматычна прымыкае да працаў „Национальное возрождение белорусов“ і „Белорусы“. Рукапіс артыкулу захоўваецца ў Бібліятэцы АН Літвы. (ф. 21, спр. 338). На жаль, я ня маю магчымасьці высьветліць, ці апублікавана гэтая праца. І наагул, наколькі мне вядома, ніхто зь беларускіх гісторыкаў ніколі не дасьледаваў ідыскія выданьні Беларусі і Літвы 1900—1939 гг.

Няма спрэчак, што важнай крыніцай па гісторыі БНР зьяўляецца дзёньнік Луцкевіча, які друкуецца ў гэтай кнізе. Апублікаваны ўпершыню ў 1991 г., ён з таго часу ў друку не зьяўляўся. За гады, што прайшлі пасьля першапублікацыі, узбагацілася наша веданьне шмат якіх пэрсаналіяў, падзеяў і абставінаў, таму ў гэтым выданьні ў камэнтары да дзёньніка ўжо не падаюцца біяграмы беларускіх палітычных дзеячоў, але затое больш грунтоўна пракамэнтаваныя паасобныя мясьціны. Зноў жа: трэба агаварыць, што цяперашнія абставіны не дазволілі мне яшчэ раз праўдзіць гэты тэкст з арыгіналам.

Мэмуарыстыка Луцкевіча заслугоўвае асобнае гаворкі. Элемэнты ўспамінаў маюцца ў шмат якіх матэрыялах, уключаных у гэтую кнігу: „Польская акупацыя ў Беларусі“, „Ме-

[1] Гл.: Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху. Менск, 2003. С. 202, 203.

[2] Гл.: Игнатенко И. М. Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии. Минск, 1992. С. 141—144.

ста і вёска“, „Жанчына ў беларускім руху“, „Уваскросшы праект“ ды інш. Але асобна трэба адзначыць „Успамін аб прэзыдэнце Масарыку“, які карэспандуецца з уласнаручнымі паказаньнямі Луцкевіча НКУС БССР[1] і зь лістом „Яго Міласьці пану Маршалку Рады Рэспублікі Язэпу Лёсіку ў Менску“. Матэрыял жа „Замест адказу“ ня толькі карэспандуецца з уласнаручнымі паказаньнямі Луцкевіча і ягоным дзёньнікам, але ўтрымівае таксама каштоўныя зьвесткі з гісторыі газэты „Гоман“.

Працяглы час узначальваючы Беларускае навуковае таварыства і Беларускі музэй імя Івана Луцкевіча пры ім, Антон Луцкевіч нямала напісаў адмыслова для „Гадавіка Беларускага навуковага таварыства“ і „Запісаў Беларускага навуковага таварыства“. Усе яго літаратура– і мастацтвазнаўчыя працы з гэтых зборнікаў передрукаваныя ў *ПКЛіМ*. Праца „Палітычны працэс Якуба Коласа і тт. (З архіву Беларускага Музэю ім. Ів. Луцкевіча)“ друкавалася таксама ў *ДГБР*. У дадзенай кнізе зьмешчаныя толькі чатыры творы Луцкевіча з *Гадавіка* і *Запісаў:* „Пятнаццаць гадоў працы Беларускага Навуковага Таварыства“, „Пячаткі полацкіх князёў у Беларускім музэі“, „Праўда аб „Мужыцкай праўдзе“ і „Прызнаньне правоў беларускае мовы падчас сусьветнае вайны“. Асобныя працы Луцкевіча, выкананыя ў рамках БНТ, публікаваліся ў зборніку „Заходняя Беларусь“, Беларускім календары на 1929 г., часопісах „Школа і Жыцьцё“ і „Novaja Varta“. У дадзеным томе зьмешчаныя толькі тыя творы, якія ня ўключаны ў *ПКЛіМ*.

Разам з тым нямала працаў Луцкевіча, прызначаных для зборнікаў БНТ, захоўваецца ў рукапісах. Некаторыя зь іх ужо апублікаваныя[2]. Да гэтага часу не друкаваўся рэфэрат „Нарадавольцы–беларусы і іх орган „Гомон“. К 50–лецьцю выхаду „Гомона“. Першы раз друкуецца тут у аўтарскім варыянце і рэфэрат „Нарадавольцы–беларусы і іх орган „Гомон“ (Да пытаньня пра эвалюцыю палітычнай ідэалёгіі беларусаў у XIX ст.)“. Гэтыя рэфэраты дапаўняе матэрыял „Беларуская miscellanea“, перакладзены з польскае.

Станаўленьне нацыі і дзяржавы немагчымае без адукацыі. І таму Луцкевіч шмат увагі надаваў праблемам школы. Ён і сам быў пэдагогам: выкладаў на настаўніцкіх курсах у Вільні, у Віленскай беларускай гімназіі, шмат выступаў зь лекцыямі. Як вядома, ён зьяўляецца аўтарам аднаго зь першых падручнікаў беларускай мовы[3] і першага падручніка беларускай літаратуры, які адначасна быў і першаю беларускаю кнігаю літаратурнае крытыкі[4]. Асаблівае месца ў біяграфіі Луцкевіча займае зьезд настаўнікаў беларускіх сярэдніх школ, які пад яго кіраўніцтвам праходзіў у Вільні ў 1923 г. Менавіта ў сувязі з гэтай падзеяй ён пісаў працу „Як вучыць у новай школе? Увагі для вучыцялёў беларускіх сярэдніх школ“, што передрукоўваецца тут.

Так сталася, што адзінаю крыніцаю інфармацыі пра некаторых дзеячоў беларускага руху зьяўляюцца нэкралёгі. Менавіта з нэкралёгаў чытачы могуць атрымаць пэўныя зьвесткі пра Вінцука Тубіса, Юзюка Пашкевіча і Казіміра Фалькевіча, айцоў Міхала Пліса і Міхала Галянкевіча, чые імёны мы сустракаем у іншых тэкстах Луцкевіча, а таксама ў дакумэнтах беларускага руху.

Асобна трэба сказаць пра дакумэнты, зьмешчаныя ў дадзенай кнізе. Гэта тэксты, пісаныя рукою Луцкевіча або рэдагаваныя ім у машынапісе. Гэта таксама тэксты, рукапісаў якіх я ня бачыў, але якія публікаваныя пад яго прозьвішчам. У разьдзел „Дадатак“ я вынес тыя дакумэнты, аўтарам ці суаўтарам якіх несумненна быў Луцкевіч, але што не пацьвярджаецца рукапісамі або папраўленымі рукою аўтара / суаўтара машынапісамі.

Само сабою, кожны твор, зьмешчаны ў гэтай кнізе, камэнтуецца.

[1] Гл.: Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху. С. 202.

[2] Гл.: Куфэрак Віленшчыны. 2004. № 1 (9); *ПКЛіМ*.

[3] Jak prawilna pisać pa–biełarusku. Wilnia, 1917; Biełaruski prawapis. Wilnia, 1918 (разам з Я. Станкевічам).

[4] Našy pieśniary: Litaraturna–sacyjalnyja narysy. Wilnia, 1918.

## II

Агляд–паказ жанравай разнастайнасьці зборніка адлюстроўвае яго зьмест толькі павярхоўна. Як ужо адзначалася, гэтую кнігу можна разглядаць як працяг і разьвіцьцё *ДГБР*. Гэта пацьвярджаецца наяўнасьцю ў кнізе шэрагу артыкулаў, якія непасрэдна прысьвечаныя гісторыі беларускага руху. Да іх адносяцца „Национальное возрождение белорусов“, „Адраджэньне нацыі“, „Жанчына ў беларускім адраджэнскім руху“, „Зь беларускага палітычнага архіву“ ды іншыя працы. У апублікаваных тут працах, акрамя ўсяго іншага, для нас важныя прызнаньні, што ў гады рэакцыі БСГ працавала пакрыёма, як напісана ў артыкуле „Крысталізацыя нацыі“, і што „Наша Ніва“ адрозьнівалася ад „Нашае Долі“ „менее „красным“ оттенком“, імкнулася „не революционизировать, а дать народу политическое воспитание, поднять его культурный уровень“. І гэта не пярэчыла задачам сацыял–дэмакратыі, бо, як пісаў Георгі Пляханаў, „высокі ровень сьвядомасьці ў працоўным насельніцтве краіны“ зьяўляецца адной з дзьвюх галоўных перадумоваў сацыялізму[1]. Пішучы гісторыю сучаснага яму беларускага руху, Луцкевіч зь сярэдзіны 1920–х пачынае паралельна дасьледаваць рэвалюцыйны рух XIX ст. У гэтай кнізе друкуюцца ягоныя працы пра Вінцэнта Канстанціна Каліноўскага і „Мужыцкую Праўду“, а таксама нарадавольцаў–беларусаў. Працы пра нарадавольцаў сьведчаць пра аўтара як пра таленавітага дасьледчыка, які даў ключ да далейшага вывучэньня беларускага народніцтва 1870—1880–х гг. Калі працы Луцкевіча былі першым этапам дасьледаваньня, дык другі этап завяршыўся кнігаю „Публицистика белорусских народников“ (1983), якую склалі Сьцяпан і Ірына Александровічы. Наступная этапная праца будзе ў значнай меры сынтэзам даробку Луцкевіча і Александровічаў.

Відавочна, што Луцкевіч паўстае перад намі ня толькі як гісторык руху, але і як яго сутворца, правадыр, ідэоляг[2]. Матэрыялы гэтае кнігі ў спалучэньні з тым, што апублікавана ў „Архівах Беларускай Народнай Рэспублікі“ Сяргея Шупы і ў *ДГБР*, прымусяць гісторыкаў нанова апісваць пэрыяд 1914—1920 г. Зрэшты, гэтае апісаньне ўжо пачалося ў працах Алеся Смаленчука аб краёвай ідэі і краёўцах[3] і Станіслава Рудовіча аб эвалюцыі беларускай палітычнай думкі[4].

Аналіз публікацыяў у „Гомане“ і архіўных дакумэнтаў, што друкуюцца ў гэтай кнізе, дазваляе зрабіць адназначныя высновы: гэта Луцкевіч аформіў і сёньня прывабную канцэпцыю Балтыйска–Чарнаморскае садружнасьці („Злучаныя Штаты ад Балтыйскага да Чорнага мора“), без Луцкевіча не было б Беларускае Канфэрэнцыі 25—27 студзеня 1918 г., Беларускае Рады ў Вільні і яе рэзалюцыі ад 18 лютага 1918 г. — правобразу Акту 25 Сакавіка. Дакумэнты, што ўпершыню друкуюцца тут, дазваляюць убачыць, што менавіта літоўскі рух за незалежную нацыянальную дзяржаву змусіў беларусаў, у першую чаргу Луцкевіча, адмовіцца ад шляхотнай канцэпцыі Канфэдэрацыі Вялікага Княства Літоўскага, ад краёвай ідэі і стаць на шлях уласна беларускага незалежніцтва.

---

[1] Гл. Тютюкин С. В. Г. В. Плеханов: Судьба русского марксиста. М., 1997. С. 331.

[2] Віднейшым пачынальнікам і правадыром беларускага нацыянальна–рэвалюцыйнага і культурнага руху назваў А. Луцкевіча Зьміцер Жылуновіч. (Гл.: Беларусь: нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху / Калектыўная праца пад агульнай рэдакцыяй А. Сташэўскага, З. Жылуновіча і Ў. Ігнатоўскага з дапамогаю А. Смоліча, С. Некрашэвіча і Я. Пятровіча. Менск: Выданьне Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае Савецкае Сацыялістычнае Рэспублікі, 1924. С. 320.)

[3] Смалянчук А. Паміж краёвасьцю і нацыянальнай ідэяй: Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях, 1864 — люты 1917. 2–е выд., дапрац. СПб., 2004.

[4] Рудовіч С. Час выбару: Праблема самавызначэньня Беларусі ў 1917 годзе. Менск, 2001. На жаль, аўтар, цытуючы І. Мялешку, не паказвае, што гэта А. Луцкевіч. Цытуюцца таксама лісты да імпэрскага канцлера ад 26.03 і 16.10.1917 г., рэзалюцыя сацыялістычнага мітынгу 16.09.1917 г. і рэзалюцыя беларускага мітынгу 30.09.1917, аднак, зноў жа, не паказана, што іх аўтар — Луцкевіч.

На падставе дакумэнтаў можна сьцьвярджаць, што Луцкевіч да самага апошняга моманту заставаўся прыхільнікам беларуска–літоўскае фэдэрацыі ці то канфэдэрацыі[1] і што Акт 25 Сакавіка, аўтарам якога ён быў, прадыктаваны галоўным чынам вонкавымі абставінамі, а найперш тым, што Беларусі пагражаў падзел паміж суседзямі. Гэта ня толькі праект польска–нямецкай зьдзелкі „Беларусь за Познаншчыну“. На пачатку 1918 г. Луцкевіч убачыў, што высокую імавернасьць мае таксама польска–бальшавіцкая дамова. Ён выпісаў у свой бляконт словы зь „Wiadomości Polskich“, якія 29 студзеня 1918 г. працытаваў „Dzień Polski“: „...уласна ўрад цяперашніх максымалістаў зьяўляецца такім урадам, зь якім можна было б найлатвей дайсьці да паразуменьня адносна атрыманьня (uzyskania) заходняй часткі Беларусі“[2]. Як паказалі пазьнейшыя падзеі, палякі добра ведалі, з кім маюць справу. Да беларускага (а не краёвага) незалежніцтва Луцкевіча штурхала і імкненьне літоўскіх дзеячаў павялічыць тэрыторыю будучай дзяржавы коштам беларускіх земляў. (Адзначым, што Луцкевіч так і не прызнаў права Літвы на Вільню.) Але непасрэднымі штуршкамі да Акту 25 Сакавіка былі Берасьцейскі мір, прызнаньне Нямеччынай незалежнасьці Літвы 23 сакавіка 1918 г. і атрыманае ў той самы дзень паведамленьне з Бэрліну, што Нямеччына не прызнае БНР.

Цэлы шэраг матэрыялаў у гэтай кнізе абвяргае міт дзеячаў Беларускай партыі сацыялістаў–рэвалюцыянэраў і Беларускай партыі сацыялістаў–фэдэралістаў пра палянафільства Луцкевіча–палітыка. Менавіта палянафільствам Луцкевіча апраўдвалі яны ўчынены імі закалот у Радзе БНР 13 сьнежня 1919 г. і стварэньне альтэрнатыўнага ўраду Вацлава Ластоўскага. Стаўленьне Луцкевіча да Польшчы было ў 1919 г. прагматычнае: паколькі Савецкая Расея не хацела прызнаваць права Беларусі на самастойны быт, ліквідавала ССРБ, а потым — фактычна — і ССРЛіБ, паколькі ўрад Францыі, у сфэру інтарэсаў якое трапіла Беларусь, таксама не прызнаваў за Беларусьсю такога права, можна было паспрабаваць „прабіць“ гэтае права праз Варшаву. Прызнала б Варшава БНР — прызналі б і краіны Антанты. Учыніўшы пераварот 13 сьнежня, эсэры і эсэфы аслабілі і без таго слабыя пазыцыі Луцкевіча ў яго перамовах зь Юзафам Пілсудзкім. (Луцкевіч лічыў, што справа незалежнасьці ў 1920–м і нават у 1921 г. яшчэ не была прайграная.) Ніякай рэальнай альтэрнатывы палітыцы Луцкевіча эсэры і эсэфы не прыдумалі. Урад Ластоўскага пайшоў па сьцежцы, пратаптанай Луцкевічам у 1918 г.[3]: пачаў перамовы з бальшавікамі. І дасягнуў таго самага выніку: бальшавікі і не падумалі прызнаваць самастойнасьць БНР. Ладзячы камэдыю перамоваў з урадам Ластоўскага (яго прадстаўляў Васіль Захарка), яны адначасна вялі перамовы зь Літвою, якія завяршыліся мірным дагаворам паміж РСФСР і Літоўскаю Рэспублікай 12 ліпеня 1920 г. і перадачай апошняй беларускіх паўночна–заходніх земляў з Вільняй уключна[4].

Акупацыя Віленшчыны дывізіяй Люцыяна Жалігоўскага, утварэньне так званае Сярэдняе Літвы, заключэньне Рыскага міру і перадача бальшавікамі ў склад Польшчы заходнебеларускіх земляў паставілі беларускіх дзеячаў, згуртаваных вакол Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні, у новыя варункі. Луцкевіч адыгрываў выключна важную ролю ў фармуляваньні беларускай палітыкі на акупаваных землях (на якія б дамовы ні спасылалася Польшча, зь беларускага пункту гледжаньня яна была акупантам, zaborcą).

---

[1] Гл. пра гэта: Сідарэвіч А. Антон Луцкевіч: ад краёвасьці да незалежніцтва (1916—1918). Агляд крыніцаў // Arche. 2006. № 1—2.

[2] LMAB. Ф. 21, спр. 321, бляконт 5.

[3] Пра перамовы з Хрысьціянам Ракоўскім Луцкевіч піша ў дзёньніку. Але ягоныя першыя кантакты з бальшавікамі адбыліся раней (гл.: Кастрычнік на Беларусі: Зборнік матэрыялаў і дакумэнтаў: (Матэрыялы да гісторыі Кастрычнікавай рэвалюцыі на Беларусі) / Улажыў С. Агурскі. Менск, 1927. Вып. 1–ы. С. 211).

[4] Трэба мець на ўвазе, што гэтыя землі былі „літоўскімі“ з 1918 г. У Берасьці РСФСР прызнала права на іх за Нямеччынай, а Нямеччына перадала іх пад кантроль Літвы. Такім чынам, 12.07.1920 г. Савецкая Расея прызнала ранейшыя міжнародныя прававыя акты.

Можна казаць, што аб'ектыўна ўмацаваньню польскіх пазыцыяў на Віленшчыне паслужылі Літва і РСФСР. Калі Ліга Нацыяў не дала правесьці выбары ў Віленскі Сойм у студзені 1921 г. і прапанавала зладзіць плебісцыт пад яе кантролем і з увядзеньнем у край міжнародных войскаў, Літва выступіла супроць гэтага, бо было відавочна, што большасьць насельніцтва ў гэтым краі нелітоўская. Супроць выступіла і РСФСР, якая баялася, што войскі Антанты могуць выкарыстаць Віленшчыну як пляцдарм для агрэсіі. Беларусы плебісцыту не баяліся, бо праваслаўная большасьць і частка каталікоў была і супроць уключэньня краю ў склад Літвы, і супроць далучэньня яго да Польшчы (нават у самых цёмных сялян не было сумненьняў, што Сярэдняя Літва — польская выдумка).

Зрываючы плебісцыт, Літва і РСФСР сваёй палітыкай прывялі да прызнаньня Віленшчыны польскаю тэрыторыяй[1]. Але да гэтага адбыліся выбары ў Віленскі Сойм (8 студзеня 1922 г.) і ў Сойм і Сэнат Польскае Рэспублікі (5 і 12 лістапада 1922 г.), якія сталі магчымыя пасьля зрыву Польшчаю і Літвою перамоваў у Брусэлі.

І хоць ніхто не абвяргае слушнасьці тактыкі байкоту выбараў у Віленскі Сойм, тактыкі, выпрацаванай беларускімі, габрэйскімі і літоўскімі арганізацыямі краю, яна не дала жаданага выніку, бо, мякка кажучы, у польскіх акупантаў было надта вялікае жаданьне далучыць Віленшчыну да „Айчызны“. А раз далучэньне Віленшчыны і астатніх заходнебеларускіх земляў да Польшчы сталася фактам, раз збройная барацьба, якую пры падтрымцы ўраду Ластоўскага вялі партызаны на Горадзеншчыне, і акцыі, якія ўчыняліся засланымі з тэрыторыі ССРБ дывэрсійнымі групамі, ня выклікалі ўсенароднага паўстаньня, трэба было падумаць „аб канстытуцыйнай абароне правоў нашага народу пад польскаю ўладай“. Дакумэнты, якія захоўваюцца ў БДАМЛМ (ф. 3, воп. 1, адз. зах. 208—210, 213, 214, 236), а таксама шматлікія публікацыі ў газэце Францішка Аляхновіча „Беларускі Звон“ дазваляюць убачыць, якую ролю адыграў Луцкевіч у арганізацыі Беларускага цэнтральнага выбарчага камітэту і Блёку нацыянальных меншасьцяў, у тым, што беларусы — на зьдзіўленьне многім — занялі ў 1922 г. пасольскія і сэнатарскія крэслы. Частка гэтых матэрыялаў друкуецца тут упершыню, яшчэ большая частка чакае сваёй публікацыі.

Не было б Луцкевіча — не было б Беларускага пасольскага клюбу. Такая мая выснова. Магчыма, яна завостраная, але нельга аспрэчыць, што менавіта Луцкевіч узначальваў выбарчую кампанію, што ён выпрацаваў структуру і тактыку БПК. Чытачы гэтай кнігі могуць пазнаёміцца таксама са Статутам БПК, які Луцкевіч напісаў сваёю рукою.

Сам Луцкевіч паслом на Сойм ня стаў. Прычына вядомая: Старшыні Ўраду БНР нельга быць парлямэнтарыем іншае краіны. Гэтую пазыцыю трэба паважаць. Але менавіта адсутнасьць Луцкевіча ў БПК і прывяла, на маю думку, да драмы беларускага руху ў Заходняй Беларусі. Тое, што адбывалася ў канцы 1920–х — пачатку 1930–х гг. у Заходняй Украіне, паказвае, што беларускае драмы нельга было пазьбегнуць, але ў тым, што яна разгарнулася менавіта гэтак, — віна Луцкевіча. На чале БПК апынуўся „немного философ, немного эстет“ Браніслаў Тарашкевіч. Ён „был хорошим парламентским деятелем, но слабым организатором, в практической работе довольно беспомощным“[2]. Луцкевіч мусіў бы адзначыць і слабавольнасьць, і палітычную блізарукасьць свайго пратэжэ. (Задамо пытаньне: а каго было паставіць на чале БПК? Неабачлівага Міхала Кахановіча, недалёкага Сымона Рака–Міхайлоўскага, аматара выпіўкі Антона Аўсяніка ці — для запалохваньня праваслаўных — кс. Адама Станкевіча?)

Тым часам Польшча ўсё больш ператваралася ў небясьпечную для беларусаў дзяржаву, дзе „плябаніі абярнуліся... у жандарскія ўпраўленьні“, дзе, бадай, кожны паліцыянт быў дзяржымордаю. Ужо ў 1923 г. у сваіх артыкулах Луцкевіч паказваў, што эндэцкі рэжым ідзе „па сьлядох фашыстаў“. Зьневажаньне нацыянальных і рэлігійных меншасьцяў

[1] Маецца на ўвазе рашэньне канфэрэнцыі амбасадараў Вялікабрытаніі, Францыі, Італіі і Японіі ад 15.03.1923 г. аб прызнаньні ўсходніх межаў Польскае Рэспублікі, г. зн. і аб прызнаньні права Польшчы на Вільню і Віленскі край.

[2] Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху. С. 225.

дапаўнялася вострым сацыяльным уціскам. Зрэшты, Луцкевіч не чакаў чаго–небудзь іншага. Сваё бачаньне афіцыйнай Польшчы ён выклаў у 1920 г. у брашуры „Польская акупацыя ў Беларусі“. З 1921 г. ён настойліва праводзіў у артыкулах „Барацьба за зямлю“, „Сяляне, арганізуйцеся!“, „Задачы сялянства“ ды іншых ідэю масавай сялянскай арганізацыі. Адразу пасьля выбараў 1922 г. ён прапанаваў на базе агітацыйных бюро і пунктаў стварыць масавы Саюз беларусаў — выбаршчыкаў у Сойм і Сэнат[1]. У статут гэтага Саюзу меркавалася запісаць два пункты: інфармаваньне насельніцтва аб працы БПК і інфармаваньне БПК аб патрэбах, скаргах і пажаданьнях насельніцтва. Аднак народныя прадстаўнікі не зразумелі ўсяе важнасьці гэтага праекту.

Трэба адзначыць, што БПК, як і Ўкраінскі Пасольскі Клюб, ня быў палітычна аднародны. 29 траўня 1923 г. у складзе УПК вылучылася сацыялістычная фракцыя (эсдэкі і эсэры). У лістападзе гэтая фракцыя склікала ў Луцку нараду ўсіх сацыялістычных групаў Валыні, Холмшчыны, Палесься і Падляшша, на якой было вырашана прыняць праграму Ўкраінскай сацыял–дэмакратычнай партыі, што дзейнічала ва Ўсходняй Галіччыне, і зьяднацца зь ёю. Паслы–сацыялісты заявілі, што „лічаць пастановы Луцкай сацыялістычнай нарады... для сябе абавязковымі і дырэктыўнымі“[2]. Менавіта такая схема ўяўлялася Луцкевічу ў канцы 1923 г., калі ён пісаў артыкулы „Малы парлямэнт“, „Адзіны фронт“, „Працоўныя гарадоў і вёсак“, калі настойліва праводзіў ідэю саюзу сялян і работнікаў. Такім чынам, мы бачым, што А. Луцкевіч падрыхтаваў ідэйны грунт для Беларускае Сялянска–Работніцкае Грамады[3]. Тарашкевічу, калі ён пісаў праграму БСРГ, ня трэба было нічога вынаходзіць.

У Заходняй Беларусі, аднак, справы пайшлі не зусім так, як у Заходняй Украіне. Тут левыя эсэры, згуртаваныя ў Беларускай Рэвалюцыйнай Арганізацыі, у самым канцы 1923 г. сталі камуністамі. Камуністычныя сэкты, якія складаліся пераважна зь людзей іншых нацыянальнасьцяў і ў кастрычніку 1923 г. былі згуртаваныя ў Камуністычную партыю Заходняй Беларусі, атрымалі моцную падтрымку. Прыход у КПЗБ Арсеня Канчэўскага, Язэпа Лагіновіча, Леапольда Родзевіча, Андрэя Капуцкага ды іншых даў партыі мову, адкрыў ёй дарогу ў вёскі, падняў аўтарытэт камуністаў у вачах беларускае інтэлігенцыі. Мы ня ведаем усіх абставінаў пераходу БРА ў КПЗБ, аднак нельга выключыць, што левых эсэраў „сваталі“ эмісары Менску і Масквы. Ва ўсякім разе вядома, што пасьля выбарчага посьпеху 1922 г. супрацоўнікі савецкага паўнамоцнага прадстаўніцтва ў Польшчы пачалі актыўна кантактаваць зь беларускімі пасламі і сэнатарамі, а адзін зь іх адмыслова прыяжджаў у Вільню да Луцкевіча.

Тое, што беларускія левыя паслы (сацыял–дэмакраты Браніслаў Тарашкевіч, Павел Валошын і Пётар Мятла, а таксама незалежны сацыяліст (былы эсдэк) Сымон Рак–Міхайлоўскі) перайшлі на бальшавіцкія пазыцыі, мае сваё тлумачэньне. Польская дзяржава усёй сваёй палітыкаю вяла да бальшавізацыі беларускага народу. Яшчэ ў 1919 г. Луцкевіч пісаў у дзёньніку, што бальшавізм — „ядыны ратунак ад польскага панаваньня“. І паўтарыў: „Ядынае antidotum проціў польшчыны — гэта бальшавізм!“ Гэтае тлумачэньне ня ёсьць, аднак, апраўданьнем. Палітык павінен быць вышэй за масы ды бачыць сутнасьць рэчаў і пэрспэктывы глыбей і ясьней. Такога бачаньня беларускія паслы–сацыялісты ня выявілі. Ім карысна было б пазнаёміцца зь лістом Уладзімера Жылкі да Луцкевіча ад 1 жніўня 1923 г. За некалькі месяцаў да пераходу БРА ў КПЗБ і задоўга да такога ж кроку паслоў гэты паэт і сацыяліст пісаў, што бальшавікі „ў грунце варожы беларускай сялянскай стыхіі і нашай нацыянальнай ідэі“; ужо тады ён бачыў імкненьне бальшавікоў „манапалізаваць беларускі рух“[4]. Настойліва прапагандуючы патрэбу масавай арганізацыі беларускага сялянства (народу), праводзячы ідэю сялянска–работніцкага ўраду, Луцкевіч, калі пачалося

---

[1] Гл.: Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху. С. 216.

[2] Змаганьне. 1923. 9 сьнеж.

[3] Гл.: Сідарэвіч А. Антон Луцкевіч і Беларуская Сялянска–Работніцкая Грамада // Arche. 2007. № 9.

[4] Жылка У. Выбраныя творы. Менск, 1998. С. 257.

стварэньне такой арганізацыі зь ягонай жа праграмаю, застаецца па–за арганізацыяй. І мы маем адназначны адказ на пытаньне „чаму?“. Луцкевіч — і гэта мы бачым у ягоных творах — падзяляў пункт гледжаньня Жылкі. Ён, хто бачыў будучую сялянска–работніцкую арганізацыю як сацыял–дэмакратычны праект, не хацеў падначальвацца камуністам.

Угледзецца ў сутнасьць падзеяў, што адбываліся ў 1920—1926 гг., дапамагае нам віленская газэта „Słowo“. У нумары за 31 жніўня 1928 г. яна пісала пра гегемонію Луцкевіча ў заходнебеларускім руху. Гаворка — пра гегемонію інтэлектуальную. І сапраўды, байкот выбараў у Віленскі Сойм, посьпех на выбарах у Сойм і Сэнат, ідэйныя асновы БСРГ — аўтарства ўсяго гэтага належала Луцкевічу. Але ў 1925—1926 гг. адбылося „wyłamanie“ беларускіх дзеячоў, якія рэпрэзэнтавалі паасобныя палітычныя плыні, „z pod hegemonji Antoniego Łuckiewicza“[1]. І хочам мы таго ці не, але ўсьлед за аўтарам „Słowa“ мусім прызнаць, што ад гэтага часу ў заходнебеларускім руху істотную ролю адыгрывалі дэструкцыйныя элемэнты (żywioły). Дэструкцыйную ролю адыгравалі ня толькі бальшавікі ды іх крэатура змаганцы. Калі змаганцы ўзрывалі беларускія ўстановы і арганізацыі знутры, дык правыя, асабліва хадэкі, атакавалі ўсё беларускае, што не адпавядала іх ідэалёгіі, звонку. І тут трэба ўлічваць, што міжваенная хадэцыя ва ўсёй Эўропе была яшчэ надта цесна зьвязаная з клерам, а ў Заходняй Беларусі яе ідэйным правадыром стаў Адам Станкевіч — сьвятар, у пэўнай меры ультракаталік і фундамэнталіст. Калі чытаць ягоныя творы і „Biełaruskuju Krynicu“, дык становіцца відавочна, што сам кс. Станкевіч і кіраваная ім газэта настойліва праводзяць думку аб немагчымасьці і нават шкоднасьці прагрэсу, адукацыі і г. д. без рэлігіі, без хрысьціянства. У залежнасьць ад вызнаньня хрысьціянскіх каштоўнасьцяў ставіліся нават прынцып сацыяльнай справядлівасьці, палітычнае і сацыяльнае вызваленьне. Кс. Станкевічу і яго паплечнікам была ўласьцівая нецярпімасьць да іншадумцаў, асабліва да атэістаў і левых. З другое паловы 1920–х гг., калі БХДЗ пераўтварылася ў БХД, абазначыліся (а чым далей, усё больш) дзьве тэндэнцыі: да аўтарытарызму кс. Станкевіча ў БХД і імкненьне БХД да манапалізацыі беларускага некамуністычнага руху[2]. З другое паловы 1920–х гг. у партыі практычна не было каму карэгаваць палітыку кс. Станкевіча. Выснова Луцкевіча пра тое, што БХД стала арганізацыяй „безадказных і безгалосых адзінак“, пацьвярджаецца Янам Станкевічам, які пісаў: „...кс. Ад. Станкевіч выбраў абмыльную дарогу ў варганізаваньню працы. Замест знаходзіць людзей із розумам, энэргіяй, воляю, ён падбіраў супрацаўнёў бяз гэтых якасьцяў, але сьлепа паслушных сабе арганістых — Я. Пазьняка, Альбіна Стаповіча, Паўла Карузу“[3].

Гісторык мусіць канстатаваць: разбурэньне адзінства беларускіх сілаў, дасягнутага падчас выбараў 1922 г., сталася магчымым перш–наперш з прычыны экспарту ў Заходнюю Беларусь сталінскай тэорыі абвастрэньня клясавай барацьбы. Тут і тое трэба мець на ўвазе, што маскоўскі шавінізм найбольш баяўся адзінага беларускага нацыянальнага фронту. Менавіта ідэя адзінага фронту наймацней падвяргалася атакам з боку бальшавіцкіх прапагандыстаў і „органаў“. Кс. Станкевіч і яго газэта казалі і пісалі праўду, калі паказвалі на бальшавіцкія, камуністычныя праявы ў беларускім руху. Але ва ўмовах эндэцкае і санацыйнае Польшчы ад такое праўды надта патыхала даносам. Луцкевіч, нягледзячы на ягоны антыбальшавізм (дакладней — антысталінізм), такое праўды пісаць ня мог. Наагул, трэба мець на ўвазе, што Луцкевіч кіраваўся нормамі сацыялістычнай этыкі, у аснове якое ляжыць ляяльнасьць да левых, клясавая салідарнасьць. Калі расейская рабочая кляса ў 1917 г. падтрымала бальшавікоў, Юлі Мартаў пісаў Паўлу Аксэльроду, што абавязак сацыял–дэмакратаў — „ні ў якім разе ня ўдзельнічаць у разгроме пралетарыяту, хоць бы

[1] У „Słowie“ памылка друку або наўмысная абраза: надрукавана „Żuckiewicza“.

[2] Пра тое, чаму бальшавікам і хадэкам не ўдалося манапалізаваць беларускі рух, але ўдалося яго раскалоць, Луцкевіч пісаў у арт. „Найгоршая балячка“.

[3] Бацькаўшчына. 1958. 18 тр.

ён і ішоў па фальшывым шляху“[1]. Луцкевіч таксама ня мог уявіць, як ён будзе змагацца з рабочаю клясаю і сялянствам, якія падтрымалі бальшавікоў і не далі ажыцьцявіцца ідэалу дэмакратычнае Беларускае дзяржавы. І ў значнай меры таму ён і ня стаў саюзьнікам Юзафа Пілсудзкага. Выдатна ведаючы пра бальшавізм Ігната Дварчаніна і кампаніі, якая разбурала беларускія культурніцкія ўстановы і арганізацыі, ён, кіруючыся нормамі сацыялістычнай этыкі, ня мог напісаць пра гэта ў газэтах, бо ўчыніў бы данос. Да таго ж многія з гэтых навасьпечаных бальшавікоў[2] былі яго даўнімі паплечнікамі і нават вучнямі. Іншая справа, што бальшавікі, у тым ліку колішнія паплечнікі і вучні, былі неляяльныя да яго. Але бальшавікі былі неляяльныя і да таварышаў па партыі. УсеКП(б) усё больш і больш жыла па законах крымінальнае групоўкі, дзе ўсё вырашае пахан.

Ініцыятар БЦВК, суstваральнік Блёку нацыянальных меншасьцяў, „аўтар“ БПК, ідэйны бацька БСРГ, Луцкевіч меў шанц ператварыць гэтую арганізацыю ва ўласна партыю ня толькі з пазытыўнаю праграмаю, але і з адпаведнымі тактыкай, мэтадамі працы. Сваё бачаньне Грамады як партыі ён выклаў у артыкуле „Хвароба росту“. Калі на тое пайшло, гэта была тактыка, выпрацаваная ў свой час Фрыдрыхам Энгельсам для нямецкіх сацыял–дэмакратаў: дзейнасьць у рамках закону, бо сацыяльнаму перавароту „ідзе на карысьць якраз захаваньне законаў“[3]. Але санацыйны рэжым зусім не зьбіраўся выконваць законы сваёй дзяржавы. Супроць БСРГ, кіраўніцтва якой мусіла б перайсьці да пазытыўнае працы, можна было, кажучы словамі Энгельса, „пусьціць у ход толькі пераварот з боку партыяў парадку, пераварот, які ня можа абысьціся без парушэньня законаў“. Пры воплесках адных і маўклівай згодзе другіх прадстаўнікоў польскага грамадзтва БСРГ была разгромленая. Спакваля хворае на шавінізм і ксэнафобію польскае грамадзтва зусім лягічна прыйшло да жудасных „пацыфікацыяў“ у Заходняй Украіне[4] і да масавага перасьледу і арыштаў праціўнікаў рэжыму ў самой Польшчы. Толькі тады, калі ў Берасьцейскую цытадэль трапілі айцы Польскае Рэспублікі, у тым ліку беларусаненавісьнікі, калі польскія нацыяналісты пачалі катаваць польскіх нацыяналістаў, у польскім грамадзтве нібыта прачнулася сумленьне. Але гэтае сумленьне „было і ёсьць хворае“, бо яно „ўмее рэагаваць толькі на той бізун, які б’ець беспасярэдня па яго скуры“. Такі дыягназ паставіў Луцкевіч у 1931 г. Створаная Юзафам Пілсудзкім, Вінцэнтам Вітасам і Войцехам Карфантым, Польская Рэспубліка стала няўтульнаю і для мноства палякаў, раз яе мусілі пакінуць і Вітас, і Карфанты.

Стаўленьне Луцкевіча да травеньскага перавароту 1926 г. і да рэжыму, усталяванага Пілсудзкім, было рэалістычнае ад самага пачатку. У гэтым мы можам пераканацца, калі прачытаем артыкулы „Спроба сілы“, „Пасьля перамогі“, „Дэклярацыі“ і „Пасьля першага кроку“. Учыніўшы крывавы пераварот, Пілсудзкі прамовіў разумныя словы: „Ня можа быць у дзяржаве зашмат несправядлівасьці ў адносінах да тых, што іншым працу сваю аддаюць!“ Пераклаўшы гэтыя словы на беларускую і працытаваўшы іх, Луцкевіч іранічна зацеміў: „Але.... але ад пекных і разумных слоў да зьдзейсьненьня іх на дзеле — яшчэ заўсёды дужа далёка. Прынамся навучыў нас, беларусаў, так глядзець на справу абяцанак і пасулаў — сам пан Пілсудзкі!..“ Луцкевічу, які не чакаў ад Пілсудзкага нічога добрага, не давялося расчароўвацца і пасыпаць галаву попелам, як гэта рабілі многія левыя дзеячы Польшчы і Заходняй Беларусі.

[1] Меньшевики в 1917 году: В 3 т. Т. 3. Ч. 2. М., 1997. С. 341.

[2] Якасьць іхняга бальшавізму невысока ацэньвалася Менскам. ЦК КП(б)Б адзначаў, што „товарищи, входящие в Громаду, не представляют из себя крепких закаленных коммунистов“ (Идеологическая деятельность Компартии Белоруссии, 1918—1945: Сб. документов: В 2 ч. Ч 1. 1918—1928. Минск, 1990. С. 192).

[3] Маркс К., Энгельс Ф. Соч. 2–е изд. Т. 22. С. 547.

[4] Нельга не здрыгануцца, калі глядзіш на фатаздымкі ў брашуры „Pogrom proti ukrajincům v Polsku“, якая выйшла ў 1930 г. у Празе. Нельга без абурэньня чытаць, як „сапраўдныя каталікі“ палякі зьдзекаваліся з украінскіх грэка–каталіцкіх сьвятароў...

Такі — рэалістычны — падыход да польскае дзяржаўнасьці абазначыўся ў творчасьці Луцкевіча, паўтару, ад самых яе пачаткаў. У сваёй бліскучай працы „Ўсходняе пытаньне і Беларусь“ (1920) Луцкевіч паказаў, у чым заключаюцца нацыянальныя інтарэсы Польшчы, калі яна ня хоча быць расьціснутай Нямеччынаю і Расеяй у Другой сусьветнай вайне. Паказаў, што ў нацыянальных інтарэсах Польшчы — прызнаньне незалежнасьці Беларусі, Літвы і Ўкраіны, наладжваньне сяброўскіх адносін з краінамі Цэнтральна-Ўсходняй і Ўсходняй Эўропы. І гэта Луцкевіч у 1919 г. зрабіў асьцярожную выснову пра тое, што „бальшавізм у Польшчы, здаецца, немінучы“, а праз колькі гадоў ён прадказаў банкруцтва ППС, якая вяла палітыку саступак капіталу. Чым далей, тым больш ён пераконваўся: для таго каб разьвязаць галоўныя праблемы гэтай краіны — і найперш сялянскае (у тым ліку зямельнае) пытаньне, трэба, „каб працоўныя масы ў Польшчы занялі пануючае палажэньне, каб сталіся пануючай клясай“, патрэбна перамога *„працоўных места над капіталам“*. На думку Луцкевіча, тое, што ад лёзунгу работніцка-сялянскага ўраду адракліся большасьць польскіх сацыялістаў, „зусім не зьмяншае правільнасьці яго“. Пілсудзкі, які „ўзьдзеў мужыкам намордні“, толькі абвастрыў праблему. І Луцкевіч пісаў, што раней ці пазьней „выпадкі пойдуць *паміма п. Пілсудзкага*“. Ведама, ён ня мог прадказаць ходу падзеяў у дэталях, але тое, што адбылося з Польшчай і ў Польшчы пазьней, аніяк не ўваходзіла ў пляны эндэкаў, хадэкаў і пілсудчыкаў, якія дэманстравалі сваю блізарукасьць і тым самым учынялі сьмяротны грэх ў палітыцы. І сялянскае пытаньне было вырашана дзякуючы менавіта работніцка–сялянскай уладзе: сяляне атрымалі зямлю, у вёсцы была ліквідавана непісьменнасьць, наладжана ахова здароўя... Праўда, Польшчы давялося заплаціць за вырашэньне сацыяльна–культурных праблемаў часткаю дзяржаўнага сувэрэнітэту. Але што зробіш, калі польскія абшарнікі і буржуазія свае кароткачасовыя сацыяльныя інтарэсы і прывілеі паставілі вышэй за інтарэсы нацыянальныя? Пісаў жа Луцкевіч у дні травеньскага перавароту, што „ня можа разьвівацца і крапчэць дзяржава, у якой залішне многа пакрыўджаных, залішне многа нездаволеных існуючым ладам“.

Оптымум, раўнавага ў будаўніцтве і разьвіцьці польскае дзяржавы дасягнутыя не былі. І прычынаю таму ня толькі сацыяльны эгаізм маёмных клясаў, але і нацыянальны эгаізм (Луцкевіч называе яго нацыянальным максымалізмам) большасьці польскага грамадзтва, у якім сталася магчымым забойства прэзыдэнта Габрыэля Нарутовіча і якое вуснамі другога прэзыдэнта, Станіслава Вайцяхоўскага, абвесьціла палякаў адзінымі гаспадарамі Польскай Рэспублікі. Сацыяльны і нацыянальны эгаізм шкодзіў Польшчы і ў 1794–м, і ў 1831–м, і ў 1863–м. Айцы Польскае Рэспублікі не зрабілі высноваў з гісторыі. Між тым Луцкевіч у 1921–м пісаў, што „польскі нацыянальны максымалізм, каторы хоча заўладаць усімі суседнімі землямі, дзе ёсьць хаця трохі палякоў, можа ў недалёкай будучыні давясьці да катастрофы, ад якой роўна пацерпім і мы ўсе, і сама Польшча“. У 1926–м, камэнтуючы сацыяльную рыторыку Пілсудзкага, Луцкевіч пытаўся: „Раз працоўныя масы — прадстаўнікі фізычнае сілы краю — не зацікаўлены ў існаваньні ўстаноўленага ладу ў дзяржаве, дык хто ж іншы і якім спосабам можа ратаваць гэту дзяржаву ад магчымых пагроз яе існаваньню?!“ І тут дарэчы будзе сказаць: у 1920–х гадох Луцкевіч толькі пацьвердзіў рэпутацыю палітычнага прагназіста. Нагадаю, што ў ліпені 1917 г. (гл. артыкул „Натуральныя саюзьнікі“) ён паказаў няздольнасьць расейскай лібэральнай буржуазіі і Часовага ўраду вырашыць сялянскае і нацыянальнае пытаньні. Ён прадказаў немінучасьць абвастрэньня барацьбы паміж пралетарыятам і буржуазіяй, непазьбежнасьць, калі на тое пайшло, пралетарскае рэвалюцыі. І ў залежнасьць ад посьпеху гэтае рэвалюцыі ён паставіў разьвязку сялянскага і нацыянальнага пытаньняў. Далейшы ход падзеяў паказаў, што Луцкевіч меў рацыю. І, мусіць, ня трэба казаць, якою мэтадалёгіяй кіраваўся ён, аналізуючы сацыяльна–эканамічную і палітычную сытуацыю як у Расеі, гэтак і ў Польскай Рэспубліцы.

## III

Рызыкі ня будзе ў цьверджаньні: ня верачы ў даўгавечнасьць Польскае Рэспублікі, Луцкевіч ня верыў таксама ў даўгавечнасьць бальшавіцкага рэжыму. Ягонае стаўленьне да бальшавізму, да савецкае ўлады, да СССР і БССР таксама патрабуе разгляду. Я ўжо паказаў, што Луцкевіч лічыў бальшавізм непазьбежным і нават адзіным antidotum „проціў польшчыны". Ужо паказана, што ў 1918 г. Луцкевіч вёў з бальшавікамі перамовы. Назіраньні за палітычнымі паводзінамі бальшавікоў дазволілі яму рабіць у 1919 г. асьцярожны прагноз: „Здаецца, што бальшавізм не прападзе, як іншыя думаюць, не разьвеецца, як дым, а толькі перажыве сур'ёзную эвалюцыю". Чаму бальшавізм не прападзе? Луцкевіч у сваім дзёньніку не дае адказу. У траўні таго самага году на гэтае пытаньне адказаў іншы марксіст. Карл Каўцкі пісаў, што бальшавікі дзеля таго, каб прыйсьці да ўлады, „выкінулі за борт свае дэмакратычныя прынцыпы". Каб утрымаць уладу, яны "свае сацыялістычныя прынцыпы адправілі ўсьлед за дэмакратычнымі". Такім чынам, бальшавікі здрадзілі сваёй праграме, „здавалі адну за адной свае пазыцыі і ў рэшце рэшт прыйшлі да адмаўленьня таго, што мелі намер заваяваць". Гэтак усталявалася бальшавіцкая дыктатура. Каўцкі рэзюмаваў: „Бальшавікі перамаглі ў Расеі, але сацыялізм пацярпеў там паразу"[1].

І тут дарэчы будзе згадаць словы Мікалая Бярдзяева пра тое, што Ўладзімер Ленін зьдзяйсьняў рэвалюцыю ў імя Маркса, але насуперак Марксу, што ў ленінізьме „Маркс быў злучаны са Сьценькаю Разіным"[2]. Марксіст Луцкевіч ня горш за іншых знаўцаў тэорыі таксама ведаў, што Расея не дасьпела да сацыялізму. Таму ён сумняваўся і ў даўгавечнасьці сацыяльнага экспэрымэнту, распачатага бальшавікамі, і ў трываласьці СССР (гл. артыкулы „Вялікі экспэрымэнтатар" і „Дзьве дарогі"). Аднак ён як сацыяліст ня мог выступаць супроць сацыяльнае рэвалюцыі, тым больш падтрымліваць контрарэвалюцыю, вастрыё якое было скіравана супроць работнікаў ды сялян і мэтаю якое была рэстаўрацыя старых парадкаў. Нават Пілсудзкі ня мог і не жадаў падтрымліваць расейскую контрарэвалюцыю (гл. арт. „Палітычныя пэрспэктывы"). Аднак калі Пілсудзкім кіравалі перш за ўсё шавіністычныя пачуцьці, імпэрыялістычныя інстынкты, дык Луцкевічам — пачуцьцё клясавае салідарнасьці.

Гэта праўда, што бальшавіцкая рэвалюцыя зьнішчыла станы (саслоўі) і адкрыла шырокую сацыяльную пэрспэктыву перад працоўнымі. Праўда і тое, што савецкая ўлада (дарма, што аддала большую частку панскае зямлі пад камуны і саўгасы) вырашыла на пэўны час аграрнае пытаньне. І хоць другое абвяшчэньне БССР у 1920 г. Луцкевіч разглядаў як няшчырую саступку маскоўскага цэнтралізму, усё ж сам факт яе абвяшчэньня даваў грунт для ўпэўненасьці, што раней ці пазьней „бясспорна зьдзейсьніцца ідэя незалежнае Беларусі". Пішучы, што ідэя незалежнасьці — „хоць няпоўна, хоць аднабока і ў другім відзе" — *„ужо рэалізуецца"*, Луцкевіч дае нам падставу меркаваць, што ён разглядаў БССР як часовую зьяву, як этап на шляху да незалежнасьці Беларусі. І недалёкія ад ісьціны былі тыя бальшавіцкія аўтары, якія вінавацілі яго ў гэтым[3].

Этап гістарычнага разьвіцьця СССР, пазначаны новай эканамічнай палітыкай і ленінскай канцэпцыяй саюзу савецкіх рэспублік, надаваў Луцкевічу аптымізму. Мы ня ведаем, ці было Луцкевічу вядома, што праграму НЭПу ў галоўных рысах выпрацавалі расейскія сацыял–дэмакраты (меншавікі) і толькі потым яе падхапілі спачатку Леў Троцкі, а затым і Ленін. Затое нам вядома, што канцэпцыя НЭПу ў пэўнай меры адпавядала поглядам самога Луцкевіча як аўтара аграрнае праграмы беларускае сацыял–дэмакратыі. І пра гэта ён пісаў у артыкуле „Места і вёска". Аднак тут трэба заценіць: вырашэньне зямельнага пытаньня ў БССР не адпавядала поглядам Луцкевіча ў самым істотным аспэкце — у аспэк-

[1] Каутский К. Терроризм и коммунизм. Берлин, б. г. С. 196.

[2] Бердяев Н. А. Истоки и смысл русского коммунизма. М., 1990. С. 86.

[3] Гл.: Зьвязда. 1929. 13 верас.; Рабочий. 1929. 15 верас. Але на тое яны й бальшавікі, каб хлусіць і казаць, што Луцкевіч хацеў аддаць Беларусь пад крыло Пілсудзкага.

це адносінаў уласнасьці. Луцкевіч прапаноўваў разьвязаць зямельнае пытаньне „на грунце *захаваньня прыватнае ўласнасьці*“, а гэта значыць, што і памешчыцкую зямлю неабходна было перадаць сялянам на правах прыватнае ўласнасьці. Луцкевіч вельмі канкрэтна агаворваў умовы, пры якіх права сялянскае прыватнае ўласнасьці абмяжоўвалася б, але не касавалася б. У СССР жа дэ–юрэ і дэ–факта сяляне (нават тыя, хто за царызмам меў зямлю ва ўласнасьці) засталіся безьзямельнымі.

Тут трэба адзначыць, што абвяшчаючы права прыватнае ўласнасьці сялян на зямлю, Луцкевіч ня быў ерэтыкам у марксізьме. У свой час „марксісцкі папа“ К. Каўцкі пісаў, што „пралетарская ўлада... ня будзе мець ні найменшага жаданьня браць у свае рукі... дробныя сялянскія гаспадаркі“, што „да гэтага часу ніводзін сур'ёзны сацыяліст не патрабаваў ніколі, каб сяляне былі экспрапрыяваныя або каб іх землі былі канфіскаваныя“. І дадаваў: „Вельмі імаверна нават, што гэтыя сялянскія гаспадаркі ўмацуюцца дзякуючы сацыялістычнаму рэжыму“[1]. Пра тое, што „канфіскацыя дробнай уласнасьці ў бліжэйшы час немагчымая“, Луцкевіч пісаў у 1906 г. у дэбютным артыкуле „Аграрная праграма“, тэкст якога мне перадаў гісторык Андрэй Унучак. У 1920 г. Луцкевіч гэтую сваю пазыцыю пацьвердзіў.

Адзначым і тое, што Луцкевіч запісваў увядзеньне НЭПу ў бясспрэчныя заслугі Леніна. Мы ня ведаем, як разгортваліся б справы далей, калі б правадыр бальшавіцкай партыі меў фізычную магчымасьць рэалізаваць свае задумы адносна НЭПу. Ягоныя ж „вучні і паплечнікі“ спыніліся на паўдарозе[2].

Як вынікае са зьмешчаных у гэтай кнізе тэкстаў, Луцкевіч адносіў да заслугаў Леніна і тое, што ў літаратуры называецца ленінскай нацыянальнай палітыкай. Зноў жа, гэтая палітыка, як і НЭП, не была вынаходзтвам Леніна, а толькі творчым разьвіцьцём у расейскіх умовах ідэяў аўстрыйскіх марксістаў, а таксама ідэяў фэдэралізму, да распрацоўкі якіх мелі пэўнае дачыненьне і БСГ, і Луцкевіч. СССР разглядаўся Леніным як рэальная фэдэрацыя саюзных савецкіх рэспублік, якія валодаюць рэальнаю нацыянальна–тэрытарыяльнаю аўтаноміяй, а народы, якія іх насяляюць, — культурна–нацыянальнаю.

Калі быць карэктным, дык нельга не адзначыць, што ў пэрыяд Першай сусьветнай вайны і адразу пасьля яе былі выпрацаваныя дзьве канцэпцыі вырашэньня нацыянальнага пытаньня — вільсанаўская і ленінская. Луцкевіч быў адным зь першых аўтараў, хто супаставіў іх (артыкул „Дзьве дарогі“) і адзначыў, што ленінізм і вільсанізм — гэта „ўвасабленьне *двух розных сьветапаглядаў, дзьвюх розных ідэалёгіяў, дзьвюх розных дарог,* па якіх думка чалавецтва імкнецца *да аднае супольнае ўсім мэты: да шчасьця народаў*“. Цікава, што адзін з выдатных марксістаў нашых дзён Імануэль Валерстайн прыходзіць да тае самае высновы, калі бярэцца давесьці, што галоўнай праблемаю вільсанізму і ленінізму „зьяўлялася палітычная інтэграцыя пэрыфэрыі сьветасыстэмы“, „што ў якасьці мэханізму такой інтэграцыі як вільсанізм, так і ленінізм разглядалі „нацыянальнае разьвіцьцё“, а істотныя рознагалосьсі паміж імі былі толькі ў пытаньні аб шляхах такога разьвіцьця“[3]. І ў Луцкевіча пра тое ж — пра дзьве дарогі. Ды, на жаль, у Луцкевіча не было катэдры і часу для акадэмічных штудыяў. Ён абмежаваўся толькі агульнымі і, як выяўляецца, глыбокімі заўвагамі. Так, у знакамітых чатырнаццаці пунктах Вільсана, на думку Луцкевіча, „разьвязваецца практычна ня справа нацыянальнасьцей, хаця там і гаворыцца аб „самавызначэньні“ іх, а справа адносінаў паміж дзяржавамі“. Апрача таго, „пункты Вільсана не далі разьвязкі нацыянальнага пытаньня, а толькі дапамаглі групе дзяржаваў умацаваць сваю ўладу над слабейшымі народамі“. Ленін жа „ўсьцярогся падмены паняцьця нацыянальнасьцей паняцьцем гаспадарстваў“ і „пайшоў па дарозе тварэньня нацыянальных рэспублік

[1] Каутский К. Общественные реформы. М., б. г. С. 162—163.

[2] У працы „З Радавае Беларусі“ і памфлеце „Цень Азэфа“ Луцкевіч вылучае як блізкага да Леніна чалавека Мікалая Бухарына. Мы ведаем, які лёс напаткаў гэтага адэпта і тэарэтыка НЭПу, якое асуджэньне сустрэў ягоны лёзунг „Абагачайцеся!“, г. зн. заклік да ўмацаваньня індывідуальнае сялянскае гаспадаркі.

[3] Валлерстайн И. Анализ мировых систем и ситуация в современном мире. СПб., 2001. С. 151.

„недзяржаўных“ народаў на асновах радавае канстытуцыі, злучаючы гэтыя рэспублікі ў вялізарны саюз“.

Нягледзячы на тое што ленінская разьвязка нацыянальнага пытаньня „аказалася больш жыцьцёвай і больш блізкай да вільсанаўскага ідэалу, чым усе дасяжэньні самога Вільсана“, Луцкевіч сумняваецца ў даўгавечнасьці гмаху, узьведзенага правадыром бальшавіцкае партыі. У артыкуле „Дзьве дарогі“ ён не тлумачыць прычыну сваіх сумневаў, а ўказвае толькі на адзін магчымы вынік ленінскай палітыкі: „недзяржаўныя“ народы, „уваходзячы ў склад ССРР, настолькі вырастуць культурна, нацыянальна і палітычна, што ніхто і нішто ня зможа ўжо іх вярнуць у стан рабства“. Ня трэба, мусіць, удакладняць: Луцкевіч бачыць, што ленінская нацыянальная палітыка наўпрост вядзе да дзяржаўнай незалежнасьці былых недзяржаўных народаў. (Мы ўжо ведаем, што Луцкевіч расцэньваў, прыкладам, БССР як ступеньку да незалежнасьці Беларусі.) І мы з вышыні гістарычнага досьведу бачым, што Луцкевіч меў рацыю. Нягледзячы на ўсе сталінісцкія і нэасталінісцкія дэфармацыі ленінскай нацыянальнай палітыкі, у пэрыяд СССР ствараўся грунт для незалежнага быту саюзных рэспублік.

І ўсё ж, высока ацэньваючы ленінскую сялянскую і нацыянальную палітыку, Луцкевіч так і ня здолеў перайсьці чырвоную рысу, якая падзяляла бальшавізм і дэмакратычны сацыялізм. Луцкевіч унік сяброўства ў БСРГ, бо бачыў, што яе кіраўнікі хаўрусуюцца з бальшавікамі, у шчырасьць якіх ён ня верыў. Луцкевіч ня мог давяраць бальшавікам хоць бы таму, што бачыў, як пасьля сьмерці Леніна мяняецца іх палітыка. На пачатку 1925 г. у артыкуле „На паўдарозе“ ён канстатаваў, што наступнікі Леніна — Рыгор Зіноўеў, Леў Каменеў ды Іосіф Сталін — „убаяліся „буржуазнасьці“ нацыянальных рухаў“ і „замест пасьледавальна разьвіваць далей лінію, распачатую Леніным у нацыянальным пытаньні, ...спыніліся на паўдарозе“. І дадае, што „маскоўскі цэнтралізм і ўнасьледаваны ад старое Расеі маскоўскі нацыяналізм сьвяткуюць у ССРР сваю перамогу, зьвёўшы чуць што не да нуля самастойнасьць „незалежных“ нацыянальных радавых рэспублік“.

Гэта, нагадваю, напісана на пачатку 1925 г. І зусім натуральна, што Луцкевіч стаў жорсткім крытыкам сталінізму ў 1929 г. Луцкевіч крытыкаваў Сталіна з пазыцыяў сацыялізму за адмаўленьне ад НЭПу і скажэньне ленінскае нацыянальнае палітыкі. Але гэта была крытыка і з пункту гледжаньня беларускіх нацыянальных інтарэсаў. Сталінізм, аднаўляючы палітыку русіфікацыі, быў скіраваны супроць беларускай нацыянальнай культуры і нацыянальнай эліты, што не магло ня весьці да запавольваньня культурнага, нацыянальнага і палітычнага росту народу і да дэфармацыяў у культурным жыцьці, у нацыянальнай і палітычнай сьвядомасьці. Марксіст Луцкевіч выдатна ведаў, што такое інтэлектуальныя эліта і грамадзкая сьвядомасьць і як яны ўплываюць на грамадзкае быцьцё... І калі ён сталінскі бальшавізм, сталінскі рэжым ставіць у адзін шэраг з італьянскім фашызмам і гітлерызмам, дык у гэтым ён сугучны Троцкаму, які паказаў ролю фашысцкіх элемэнтаў у сталінскай палітыцы другое паловы 1920–х гг.[1], і Бярдзяеву, які (праўда, у 1937 г.) пісаў, што сталінізм „перараджаецца незаўважна ў своеасаблівы рускі фашызм“[2]. Зацемім, што ў заходніх левых зачараванасьць Савецкім Саюзам пачала праходзіць толькі пасьля маскоўскіх працэсаў 1936—1938 гг., грамадзянскай вайны ў Гішпаніі ды пакту Рыбэнтропа—Молатава[3].

Але вернемся назад. На пачатку 1920–х Луцкевічава стаўленьне да бальшавікоў было такое ж, як і да палякаў у 1919—1920 гг.: прагматычнае. Вядома, што А. Луцкевіч — асабліва пасьля выбараў у Сойм і Сэнат — атрымаў магчымасьць у пэўнай меры ўплываць на палітыку бальшавікоў у БССР. Як вынікае зь яго ўласнаручных паказаньняў, на просьбу савецкага паўнамоцнага прадстаўніцтва ў Польшчы Луцкевіч склаў даклад аб тым, „какие мероприятия были бы желательны в БССР с точки зрения западных белорусов“[4]. Ён

[1] Гл., напр.: Троцкий Л. Моя жизнь: Опыт автобиографии. М., 1991. С. 507.

[2] Бердяев Н. А. Истоки и смысл... С. 120.

[3] Гл.: Брандт В. Воспоминания. М., 1991. С. 127.

[4] Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху. С. 218.

прапанаваў бальшавікам: 1) вырашыць пытаньне пра павелічэньне тэрыторыі БССР, 2) разгарнуць культурную працу, 3) абвясьціць амністыю дзеячам БНР, 4) арганізаваць тэрытарыяльныя войскі. Як мы ведаем, усе гэтыя пастуляты ў той ці іншай меры былі рэалізаваныя праз „узбуйненьні" БССР (вяртаньне ў склад Рэспублікі часткі яе земляў, захопленых Расеяй 16 студзеня 1919 г.), „беларусізацыю", амністыю 1923 г. і іншыя мерапрыемствы. Артыкулы „Будаваньне Беларусі", „Вялікая пара!", „Расьце Беларусь!" і „Савецкая амнэстыя" даюць дастатковае ўяўленьне пра тое, як Луцкевіч ставіўся да гэтых акцыяў бальшавікоў.

Далей будзе гаворка аб рамантычных момантах у Луцкевіча як палітычнага мысьліцеля. Калі мы сустракаем, напрыклад, у артыкулах „У адкрытыя карты" і „Ў восьмую гадавіну" (1926), якія засталіся па–за гэтаю кнігаю, цьверджаньні, што сацыяльны ідэал вызваленьня працоўнае Беларусі „ўжо непадзельна запанаваў на Ўсходзе", што „там... *праз сацыяльнае вызваленьне* перад беларусамі адкрылася магчымасьць дзяржаўнага будаўніцтва", што "там — і толькі там — беларуская дзяржаўнасьць сталася *зьдзейсьненым фактам*", калі мы чытаем у артыкуле „Зь беларускага палітычнага архіву", што „беларускі работнік і селянін мазалістай рукой сваей упісывае ў кнігу сусьветнае гісторыі імя сваей Бацькаўшчыны *як рэальна існуючай дзяржавы*", то павінны запытацца: ці сьведчаць гэтыя выказваньні, што Луцкевіч быў зачараваны палітыкай „беларусізацыі" і вяртаньнем у 1924 г. у склад Беларусі часткі яе ўсходніх земляў? Не, ня сьведчаць. У артыкулах „Вялікая пара!" і „Расьце Беларусь!" Луцкевіч дэманструе сваю незадаволенасьць тэмпамі і маштабамі таго самага „ўзбуйненьня" БССР. Думаецца, элемэнты ідэалізацыі Савецкай Беларусі тлумачацца звычайнаю дыпляматыяй: нахвальваньне, лёстачкі пускаліся дзеля таго, каб дамагчыся большага. Па–другое, калі Луцкевіч пісаў пра БССР як рэальна існуючую дзяржаву, дык ён ня дужа памыляўся. Што б там ні казалі, БССР існавала рэальна і дэ–юрэ ня ў складзе Расеі. І калі БССР не была дзяржаваю з усімі атрыбутамі сувэрэнітэту, яна разглядалася Луцкевічам як аснова, падмурак будучае Беларусі. Вітаючы ў 1924 г. *„будаваньне і зьбіраньне Беларусі",* Луцкевіч выказваў „нязломную веру, што раней ці пазьней *адбудуецца Беларусь наша так, як у нашых снах–летуценьнях мы яе сабе выабражаем".* Мяркую, што ні ў кога ня будзе сумненьня наконт створанага ў снах–летуценьнях Луцкевіча вобразу адбудаванае, г. зн. непадзеленае і непадзельнае, Беларусі.

## IV

Агляд творчасьці Луцкевіча быў бы няпоўны, калі б мы адмыслова не закранулі яшчэ некалькі пытаньняў. Па–першае, усе вядомыя мне тэксты Луцкевіча, у т. л. матэрыялы, зьмешчаныя ў *ДГБР* і ў гэтым томе, начыста абвяргаюць тэзіс бальшавіцкай прапаганды пра ягоны нацыяналізм і нават шавінізм. Калі Луцкевіч і быў нацыяналістам, дык роўна настолькі, наколькі быў патрыётам, і, заўважым, значны час ён быў патрыётам не Беларусі, але ўсяго Беларуска–Літоўскага краю, г. зн. краёўцам. Амэрыканскі гісторык Тыматы Снайдэр піша, што літоўскія патрыёты пачатку XX ст. „зьвярталіся да ўяўнага Вялікага Княства Літоўскага" і адмовіліся ад рэальнай пераемнасьці з традыцыяй раньняга новага часу на карысьць міту пра сярэднявечную Літву і Vilnius да Люблінскай уніі з Польшчай"[1]. Гісторык мусіў бы дадаць, што Луцкевіч — у адрозьненьне ад літоўцаў — глядзеў на ВКЛ рэалістычна:

[1] Снайдэр Т. Спрэчкі за літоўска–беларускую Айчыну // Дзеяслоў. 2004. № 11. С. 175. Праца, што друкавалася ў трох нумарох часопісу, паказвае, па-першае, пралітоўскую арыентацыю аўтара і, па–другое, слабае веданьне беларускіх крыніцаў. Зрэшты, адкуль яму іх ведаць, калі Інстытут гісторыі Акадэміі навук, гістарычныя факультэты ВНУ ды іншыя ўстановы так і не наладзілі сыстэматычнага вывучэньня і публікацыі дакумэнтаў і матэрыялаў беларускага руху XX ст.? Дарэчы, Т. Снайдэр дае даволі сымпатычную „сыльвэтку" Луцкевіча (гл. с. 202 у № 13 „Дзеяслова").

як на поліэтнічную (перш–наперш беларуска–літоўскую або літоўска–беларускую) дзяржаву. Адсюль і канцэпцыя Канфэдэрацыі Вялікага Княства Літоўскага. Спадчынаю ВКЛ можна растлумачыць і канцэпцыю Злучаных Штатаў ад Балтыйскага да Чорнага мора. Магчыма, Луцкевіч сваімі ідэямі апярэджваў час. Мы ведаем, што тады, калі ён фармуляваў ідэю балтыйска–чарнаморскай садружнасьці, Ленін, улавіўшы дух часу, лічыў незьдзяйсьняльным ня менш шляхотны лёзунг Злучаных Штатаў Эўропы. Цяпер жа, калі гэты лёзунг рэалізуецца, вельмі імаверна, што ў аб'яднанай Эўропе зьявіцца балтыйска–чарнаморскі рэгіён. І хто ведае, якія адносіны складуцца ў рэшце рэшт паміж Беларусяй і Літвой?

Калі ж вяртацца да пытаньня пра нацыяналізм Луцкевіча, дык нельга не заўважыць, што гэты грэх яму прыпісвалі прадстаўнікі пануючых нацыяў — напрыклад, расейскія бальшавікі (беларускія будуць ім падпяваць) і польскія сацыялісты. Першыя лічылі, што найлепш беларусы будуць пачувацца ў СССР, другія — што ў Польшчы. І тыя, і другія дзялілі Беларусь у Рызе. Нацыяналізмам і бальшавікі, і польскія сацыялісты лічылі жаданьне Луцкевіча, каб беларусы жылі самастойна, размаўлялі на сваёй мове. ППС заклікала да барацьбы зь беларускім і ўкраінскім рухамі, „забываючы, што нават буржуазны вызваленчы нацыянальны рух паняволенага народу мае паступовы характар і зьяўляецца ў пэўнай меры саюзьнікам пралетарыяту ў яго барацьбе за вызваленьне, бо аслабляе сілы буржуазіі пануючай нацыі“.

Разважаньні Луцкевіча (з марксісцкага і агульнагістарычнага гледзішча зусім слушныя) для польскага сацыяліста 1920–х гг. былі непрымальныя, бо ён кіраваўся паняцьцем *racja stanu,* хоць у тым разуменьні *racji stanu,* як паказала гісторыя, было мала рацыянальнага. Бальшавікі ж, дэмагагічна абвесьціўшы спаўненьне сацыяльных і нацыянальных ідэалаў у СССР, лічылі ўсякія незалежніцкія памкненьні контрарэвалюцыяй. Мала таго: калі ў 1929—1930 гг. адбывалася рэвізія гісторыі БСГ, „Нашае Нівы“ і ўсяго беларускага руху, калі бальшавікі манапалізавалі спадчыну сацыял–дэмакратыі ды абвясьцілі ўсе іншыя плыні ў сацыял–дэмакратычным руху антынароднымі, контрарэвалюцыйнымі і г. д., Луцкевіч таксама быў „адлучаны“ ад сацыял–дэмакратыі і абвешчаны сацыял–фашыстам, правадыром нацыянал–фашыстаў і нацыянал–дэмакратаў (яны ж нацыянал–шавіністы)[1].

Такім чынам: для бальшавікоў з канца 1920–х гг. Луцкевіч не марксіст. А вось для нацыяналістаў — марксіст, і ў гэтым, калі чытаць Станіслава Станкевіча[2], была ці не віна яго. Праўда, калі гаворка заходзіла пра такую нацыянальную каштоўнасьць, як „Наша Ніва“, Луцкевіч пераставаў быць марксістам. І той самы нацыяналіст Станкевіч салідарызаваўся з бальшавікамі і пісаў: выснова пра тое, што ў рэдакцыі „Нашай Нівы“ былі людзі, якія падзялялі марксісцкія думкі, пасьпешлівая і неабгрунтаваная[3]. Між тым, бадай, усе матэрыялы гэтае кнігі даюць падставу меркаваць, што аўтар яе — чалавек радыкальна левых перакананьняў, які выступаў за бязвыплатную перадачу зямлі сялянам, за вырашэньне рабочага пытаньня ў духу сацыял–дэмакратычнай праграмы і г. д. Клясычны марксізм, як вядома, вызнае закон адпаведнасьці вытворчых адносін характару і ўзроўню разьвіцьця прадукцыйных сілаў. Што Луцкевіч вызнаваў гэты закон, сьведчаць ягоныя артыкулы „На-

[1] Крыніцы даводзяць, што пра „нашаніўскі шавінізм“ ці ня першы загаварыў Максім Гарэцкі — на Акадэмічнай канфэрэнцыі 1926 г. Адповедзь яму даваў Зьм. Жылуновіч, які абвяргаў тэзіс Гарэцкага наступнымі аргумэнтамі: „Няхай ён [Гарэцкі] не забывае, што кіраўніцтва „Нашаю Ніваю“ цалкам знаходзілася ў руках сацыял–дэмакратаў, як: А. Навіна, Ян Луцкевіч, А. Бурбіс і інш., і вялікая большасьць пісьменьнікаў нашаніўцаў таксама належалі да гэтае партыі, як–та: Ц. Гартны, С. Палуян, Ф. Шантыр, А. Гурло, Хв. Чарнушэвіч, Я. Лёсік і да іншых сацыялістычных партый — А. Гарун, Л. Лобік, Л. Гмырак і інш. Як–та магло стацца, як бы яны былі шавіністамі ў час, калі ўвесь беларускі рух укладаўся выключна ў рамкі рэвалюцыйнасьці. Гэта тайна тав. М. Гарэцкага...“ (Працы Акадэмічнае канфэрэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі (14—21 лістапада 1926 г.) / Пад. рэд. С. Некрашэвіча і Ў. Ігнатоўскага. Менск, 1927. С. 373). З канца 1920–х гг. гэтыя Жылуновічавы аргумэнты ня дзейнічалі, дый дыскусія стала немагчымаю.

[2] Гл.: Крыніца. 1998. № 6. С. 54.

[3] Гл.: Крыніца. 2000. № 11—12. С. 221.

пружанае змаганьне“, „Дзьве разьвязкі зямельнага пытаньня“ ды інш. Марксіст Луцкевіч ня мог ня ўлічваць адметнасьцяў Беларусі. Так, дастасоўваючы да беларускіх умоваў лёзунг рабоча–сялянскага ўраду, ён мусіў памяняць яго на лёзунг сялянска–работніцкага ўраду. І гэты лёзунг, як мы ведаем, быў упісаны ў праграму БСРГ.

Як і іншыя марксісты, Луцкевіч у сваіх развагах быў падчас надта ідэалістычны, рамантычны. Так, ён пісаў, што „працоўны народ ніколі не зацікаўлены ў уціску і вызыску другога працоўнага народу“ („Рэалізацыя ідэі незалежнасьці“). Здаецца, эпоха імпэрыялізму абвергла гэты тэзіс. А цьверджаньне ў тым самым артыкуле, што „клясавае вызваленьне нясе з сабою і нацыянальнае вызваленьне“ было ня больш як пастулятам раньняга марксізму, які ўзьнік у пэрыяд даманапалістычнага, даімпэрыялістычнага капіталізму. Гэты пастулят бальшавікі ператварылі ў догму, ігнаруючы тое, што пісаў Фрыдрых Энгельс пад старасьць. А ў 1882 г. ён канстатаваў, што „ліквідацыя нацыянальнага прыгнёту зьяўляецца асноўнай умовай усякага здаровага і свабоднага разьвіцьця“[1] і што інтэрнацыянальны рух пралетарыяту (г. зн. і інтэрнацыяналізм) „наагул магчымы толькі паміж незалежнымі нацыямі“. І Луцкевіч, нягледзячы на моманты ідэалізму, усё ж стаяў на пазыцыях сталага марксізму.

Элемэнты ідэалізму, рамантызму ўласьцівыя, бадай, кожнаму палітычнаму мысьліцелю, і ў тым, што іх не пазбаўлены быў Луцкевіч, няма ніякага дзіва. І ўсё ж менавіта як мысьліцель ён сумняваўся ў даўгавечнасьці распачатага бальшавікамі сацыяльнага экспэрымэнту і створанага імі СССР. Не ў апошнюю чаргу гэтыя сумненьні спароджаныя тым, што Луцкевіч, як марксіст, быў эвалюцыяністам.

У пэрыяд пасьля рэвалюцыі 1905 г. Луцкевіч зусім цьвяроза разважаў, што напачатку павінна паўстаць беларуская інтэлігенцыя, і гэтая інтэлігенцыя „адыграе роль асяродка, ля якога будзе адбывацца гуртаваньне, крысталізацыя беларускае нацыі“ („Крысталізацыя нацыі“). Ведама, значная частка гэтай інтэлігенцыі будзе „па сваей ідэалёгіі, пэўне ж, буржуазная“. У працы „Эканамічная эвалюцыя і беларускі рух“ (1917) Луцкевіч разважаў і пра тое, што „беларускі народ прыпазьніўся, раўнуючы да другіх“[2], у сваім разьвіцьці, што „да самых нядаўных часоў у Беларусі захавалася асаблівая будова грамадзянства: разьдзел на клясы і станы быў зусім зьвязан з разьдзелам нацыянальным“. Як эвалюцыяніст Луцкевіч ведаў: перш чым паўстане беларуская дзяржава, павінна паўстаць дыфэрэнцыяваная нацыя з магутным пластом інтэлігенцыі; гэтая нацыя павінна атрымаць культурна–нацыянальную аўтаномію, стварыць нацыянальную школу, нацыянальныя Царкву і Касьцёл, прайсьці праз фазу суб’екта Расейскае дэмакратычнае фэдэрацыі і, пазбавіўшыся ўлады расейскага чынавенства, увесьці самакіраваньне, арганізаваць эканамічнае жыцьцё, а ўжо потым будаваць свой незалежны быт, або *„сваё поўнае нацыянальнае жыцьцё“*. І ўсё гэта — фазы нацыянальнае рэвалюцыі[3].

Натуральна, што ідэалам Луцкевіча, як і БСДП, быў дэмакратычны лад, бо пры ім „старое грамадзтва магло б мірна ўрасьці ў новае“[4], бо дэмакратычная рэспубліка, як пісаў, зноў–такі, Энгельс, „зьяўляецца нават спэцыфічнай формай для дыктатуры пралетарыяту“. Аднак здарылася тое, чаго не прадбачылі ні Маркс, ні Энгельс: сацыялізм пачалі будаваць у адсталай Расеі. Ленін, нават калі ён пераканаўся, што Расея эканамічна і культурна да сацыялізму абсалютна ня высьпела, і перайшоў да НЭПу, у палітычным пляне так і застаўся ворагам дэмакратыі. Асабліва ж бальшавіцкі антыдэмакратызм прапагандаваў Троцкі. Палемізуючы зь ім, Каўцкі ў 1921 г. пісаў: „...я гатовы ахвотна прызнаць, што ў пагардзе Троцкага да дэмакратыі „няма і сьледу марксісцкага мысьленьня“. У гэтай пагардзе

---

[1] Маркс К., Энгельс Ф. Соч. 2–е изд. Т. 35. С. 220.

[2] Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху. С. 67.

[3] Акрамя артыкулу „Будаваньне незалежнай Беларусі“, А. Луцкевіч піша пра нацыянальную рэвалюцыю таксама ў літаратуразнаўчых працах „На новых шляхох“ ды „Янка Купала ў крывым люстры“ (гл. у *ПКЛіМ*).

[4] Маркс К., Энгельс Ф. Соч. 2–е изд. Т. 22. С. 236.

„адчуваецца толькі голае імкненьне якімі заўгодна сродкамі ўтрымаць у руках уладу, якая была захоплена дзякуючы спрыяльнаму зьбегу выключных абставінаў. У гэтым... ёсьць свайго роду матэрыялізм, але, ва ўсякім разе, ня той, якому належыць будучыня“[1].

Такім чынам, Луцкевіч, сумняваючыся ў пэрспэктывах бальшавіцкіх экспэрымэнтаў, мысьліў, як і „марксісцкі папа“. Аднак ён, у адрозьненьне ад Каўцкага, не прадбачыў, што бальшавізм рухаецца да „дзяржаўнага рабства“. Быў час, калі ён нават схільны быў паверыць, што ў БССР адбываецца стварэньне новага асяродку беларускага руху і што „гэты асяродак — *работніцка–сялянская, свая сацыяльна і нацыянальна, улада*“. І ўсё ж паўтару: марксісцкі эвалюцыянізм і сацыялістычны дэмакратызм трымалі Луцкевіча на дыстанцыі ад бальшавізму.

Гэта цяпер мы ведаем, што бальшавікі займаліся не будаўніцтвам сацыялізму, а развальвалі і дабудоўвалі тое, на што не хапіла сілы і мужнасьці расейскай буржуазіі. Наагул, бальшавіцкая і бальшавізаваныя дыктатуры паўсталі ў тых краінах Эўропы, дзе былі слабая буржуазія, неразьвітая грамадзянская супольнасьць і слабыя дэмакратычныя інстытуты[2]. У ходзе „будаўніцтва сацыялізму“ бальшавікі вырашалі задачы, якія ў разьвітых краінах Захаду былі разьвязаныя буржуазнымі рэвалюцыямі і рэформамі: ліквідацыя саслоўнага ладу, індустрыялізацыя, ліквідацыя непісьменнасьці, мадэрнізацыя і г. д. Думаючы, што задачы буржуазнай рэвалюцыі яны вырашаюць „попутно“, бальшавікі якраз на гэтым і спыніліся. Яны ані не наблізіліся да вялікага ідэалу Маркса і Энгельса — да грамадзтва, у якім „на месца старога буржуазнага грамадзтва зь яго клясамі і клясавымі супрацьлегласьцямі прыходзіць асацыяцыя, у якой свабоднае разьвіцьцё кожнага зьяўляецца ўмовай свабоднага разьвіцьця ўсіх“. Замест асацыяцыі яны стварылі сыстэму „дзяржаўнага рабства“, дзяржаўнага капіталізму. У іх так кепска было з сацыяльным прагрэсам, што Міхаіл Гарбачоў вымушаны быў узьняць лёзунг „Больш сацыялізму!“ праз 70 гадоў бальшавіцкае ўлады. Зазнаўшы „сур'ёзную эвалюцыю“, бальшавізм прывёў да таго, пра што Луцкевіч пісаў у 1924 г., — „да поўнага развалу спробы рэалізацыі сацыялістычных ідэалаў, да „старога карыта“ — да ўзнаўленьня капіталізму“, які мы назавем нэакапіталізмам. Спраўдзіўся асьцярожны прагноз Бярдзяева: „Магчыма нават, што буржуазнасьць у Расеі зьявіцца менавіта пасьля камуністычнай рэвалюцыі“[3].

Выявілася, што пераскочыць стадыі і фазы эканамічнага, сацыяльнага, культурнага і палітычнага разьвіцьця немагчыма, а тым болей немагчыма — насуперак Марксу — пабудаваць сацыялізм у адной, асобна ўзятай, да таго ж адсталай, краіне (Валерстайн катэгарычна сьцьвярджае, што СССР „заўсёды заставаўся часткаю і ўдзельнікам капіталістычнай сьветаэканомікі і ніколі не знаходзіўся па–за ёю“[4]).

Паддаючыся рамантычнаму настрою, Луцкевіч мог бачыць у амністыі для дзеячоў БНР перамогу „нацыянальнага прынцыпу ў савецкім дзяржаўным будаўніцтве“ і нават верыць што ў будаўніцтва „вялізарнага, незвычайна зложнага гмаху Беларускае Савецкае Сацыялістычнае Рэспублікі“ могуць „прылажыць свае сілы, унясьці сваю ідэалёгію ўсе жывыя беларускія элемэнты бяз розьніцы партыі і кірунку“, г. зн. верыць у тое, што можна было б назваць плюралізмам ва ўмовах бальшавіцкае ўлады[5]. Ён мог „ад шчырага сэр-

---

[1] Каутский К. Диктатура полетариата. От демократии к государственному рабству. Большевизм в тупике. М., 2002. С. 131.

[2] Выключэньне складае, бадай, адна Чэхаславакія. Аднак калі згадаць пра адставаньне Славакіі, дык усталяваньне камуністычынага рэжыму ў гэтай краіне таксама было заканамерным. І ўжо зусім апраўданы гэты тэзіс у дачыненьні да пасьлядоўна сталінісцкага рэжыму ў Альбаніі ці рэжыму Ёсіпа Броз Ціта ў Югаславіі.

[3] Бердяев Н. А. Истоки и смысл... С. 119.

[4] Валлерстайн И. Анализ мировых систем... С. 14.

[5] Аб плюралізьме пэрыяду НЭПу гл.: Коэн С. Бухарин: Политическая биография, 1888—1938. М., 1989. С. 331—337.

ца“ заклікаць беларускіх эмігрантаў: „Калі хочаце адыграць нейкую ролю ў будаваньні беларускае нацыі, калі хочаце нешта сваё ўкласьці ў агульнанацыянальную беларускую скарбніцу, — *варочайцеся дадому!*“ Але мы ведаем і тое, што Луцкевіч ніколі не забываўся на расейскі цэнтралізм і не выключаў — разам з развалам сацыялістычнага экспэрымэнту — адбудовы „единой, неделимой“ Расеі. Сумняваючыся ў даўгавечнасьці пабудаванага Леніным гмаху СССР, ён выказваў меркаваньне, што новым пакаленьням давядзецца ў ім „шмат што перарабіць“. Ён, паўтаруся, бачыў, што па сьмерці Леніна бальшавікі спыніліся „на паўдарозе“ ў ажыцьцяўленьні нацыянальнае палітыкі...

Сама лёгіка бальшавіцкага рэжыму, які імкнуўся да экспансіі, і сама падпарадкаваная гэтай мэце сыстэма „дзяржаўнага рабства“ патрабавала цэнтралізацыі і адмаўленьня ад прынцыпаў фэдэралізму. Ленінская візія СССР была пахаваная ў канцы 1920–х гг., а пасьведчаньнем аб яе сьмерці стала Канстытуцыя СССР 1936 г.: у гэтым дакумэнце ані словам ня згадваліся Дэклярацыя і Дагавор аб утварэньні Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. І ўсё ж і з прычыны высокага аўтарытэту Леніна, і ў сілу лёгікі бальшавіцкага рэжыму, які, імкнучыся да экспансіі, мусіў дэманстраваць „вырашэньне нацыянальнага пытаньня“, адносная аўтаномія саюзных рэспублік не была скасаваная, а самі рэспублікі ня сталі часткаю Расеі.

На прыкладзе сталінскай палітыкі мы можам знайсьці пацьверджаньне ленінскіх словаў пра тое, што рэакцыйныя сілы іншы раз, самі таго ня хочучы, робяць прагрэсіўныя справы. Тут гаворка ідзе перш за ўсё пра далучэньне да БССР Заходняе Беларусі, якое сталася магчымым пасьля змовы Гітлера і Сталіна. І хоць БССР ахапіла ня ўсе беларускія землі, была дасягнутая еднасьць пераважнай большасьці беларускага народу. Пры ўсіх дэфармацыях і скажэньнях у крышталізацыі нацыі, пры ўсіх непапраўных стратах Беларусь перастала быць як Паўночна–Заходнім краем Расеі, так і паўночна–ўсходнімі крэсамі Польшчы. Ёй заставалася толькі стаць незалежнаю.

Луцкевіч быў упэўнены, што *„толькі свая дзяржаўнасьць дасьць нашай Бацькаўшчыне праўдзівую волю і шчасьце“*, бо „толькі *празь незалежнасьць* вядзе дарога да супольнага жыцьця з тымі з нашых суседзяў, зь якімі нас злучаюць супольныя інтарэсы — чы то будзе канфэдэрацыя, чы фэдэрацыя, чы дзяржаўны саюз“, бо „безь незалежнасьці гэткае супольнае жыцьцё абернецца ў паняволеньне нашае Бацькаўшчыны“, бо „безь незалежнасьці мы заўсёды будзем лічыцца нечыяй рэчай“. І хто абвергне гэтыя словы Луцкевіча?

*Анатоль Сідарэвіч*